У ПРАЦЫ, ЯК У БАЇ



П. Я. КАНДРАЦЕНКА.

ЛЕТАМ 1944 года сержант Пётр Ягоравіч Кандраценка ўдзельнічаў у баях за вызваленне Лепеля. 26 чэрвеня стралковы полк, у якім служыў сержант, выйшаў да шасэйнай дарогі Лепель—Віцебск. Па шасэ суцэльным патокам адступалі ворагі. З недалёкай адлегласці сапёры адкрылі агонь. 18 гітлераўцаў знішчыў з аўтамата Кандраценка ў гэтым баі, а 24—узяў у палон.

Неўзабаве ў бой уступілі роты палка. І пасля кароткага бою вораг у паніцы ўцёк, кінуўшы на дарозе вялікую колькасць узбраення, боепрыпасаў, транспартных сродкаў. Нашы байцы захапілі таксама калону аўтамашын. Камандзір загадаў стралковаму батальёну праследаваць адступаючага ворага на трафейных машынах, папярэдне агледзеўшы іх.

Выявілася, што на ўсіх машынах у розных месцах былі пастаўлены мудрагелістыя, старанна замаскіраваныя міны. Адны з іх маглі ўзарвацца адразу, іншыя—пасля. Машыны трэба было размініраваць. У сапёрным узводзе сержант Пётр Кандраценка лічыўся самым вопытным майстрам. Яму і было загадана абясшкодзіць нямецкія міны. Ведаючы каварства ворага, сапёр дзейнічаў уважліва і асцярожна. Але і марудзіць нельга—трэба было не даць праціўніку далёка адысці. За тры гадзіны сержант выканаў заданне, зняўшы з машын 22 міны. За тры гадзіны ён 22 разы перамог смерць. І вось батальён рухаецца ўперад, праследуючы ворага. Гэта не адзіны ратны ўчынак савецкага воіна.

На світанні 23 чэрвеня 1944 года пасля магутнай артылерыйскай падрыхтоўкі пачалося наступленне нашых войск. Але прасоўванню штурмавога батальёна на адным з участкаў перашкаджала ўцалеўшая агнявая кропка праціўніка. Сержант падпоўз да амбразуры дзота і закідаў яе гранатамі. Батальён узняўся ў атаку, прарваў першую паласу абароны.

За смелыя дзеянні ў раёне Лепеля камсамольцу Пятру Ягоравічу Кандраценку Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 ліпеня 1944 года было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У цяперашні час Пётр Ягоравіч Кандраценка жыве ў горадзе Салікамску, заняты мірнай працай. Камуніст з ліпеня 1944 года, Пётр Ягоравіч Кандраценка паказвае прыклад у працы. У калектыве цэха, у якім ён працуе, карыстаецца вялікім аўтарытэтам. Часта выступае перад моладдзю, дзеліцца вытворчым вопытам і ўспамінае аб баях, у якіх яму даводзілася ўдзельнічаць. У працы, як і ў баях, Герой Савецкага Саюза Пётр Ягоравіч Кандраценка заўсёды ўперадзе.

П. ФРАЛОЎ.